сцэны. Кн. 3. Мн., 1978; Смольскі Р. Пазначана часам: Пошукі сучаснай беларускай рэжысуры. Мн., 1984; Баравік Р.І. Рэжысура Беларусі: Праблемы канцэптуальнасці спектакляў. Мн., 2000. *Р.І.Баравік* (у драм. тэатры), *А.Б.Ладыгіна.*

**РЭЖЫСЁРСКІ ЭКЗЭМПЛЯ́Р** п'есы 1) экзэмпляр п'есы, у якім рэжысёр-пастаноўшчык адзначае мізансцэны спектакля, сцэнічныя эфекты, апісанне грыму, касцюма і інш. 2) Экзэмпляр п'есы з паметамі на палях *памочніка рэжысёра.* На Р.э. фіксуецца знешні бок спектакля: адзначаюцца рэплікі для выхаду выканаўцаў, змены святла, дэкарацый, момантаў апускання заслоны і інш. *Р.І.Баравік.*

**РЭЗАНЁР**, гл. ў арт. *Амплуа.*

**РЭКВІЗІ́Т** (ад лац. requisitum патрэбнае, неабходнае), сукупнасць абсталявання і рэчаў (сапраўдных і бутафорскіх), неабходных акцёрам у час сцэнічнага дзеяння (мэбля, посуд і інш.). З'яўляецца дапаўненнем да сцэнічнага касцюма (напр., парасон, хусцінка, партфель, упрыгожанні і інш.), займае значнае месца ў дэкарацыйным убранні сцэны, дапамагае стварыць вобраз эпохі, прыкметы часу, месца дзеяння, вылучыць асобныя рысы характару персанажа. Асабліва значэнне мае ў гіст. і класічных творах. Зыходным Р. называюць ежу, напіткі, тытунь, жывыя кветкі і інш. У тэатры абсурду Р. трансфармуецца ў рэчы-метафары, якія ўмешваюцца ў жыццё індывідаў, становяцца паўнацэннымі персанажамі і запаўняюць сцэну. Дакладны падбор Р. — адна з гал. творчых задач мастака. *І.А.Алекснiна.*

**РЭМА́РКА** (ад франц. remarque заўвага), аўтарскае тлумачэнне, указанне для чытача, пастаноўшчыка і акцёра ў тэксце п'есы, што змяшчае ў сабе кароткую характарыстыку абставін дзеяння, знешнасці, манеры вымаўлення і асаблівасцей паводзін персанажаў. Мае важнае значэнне для чытання і асабліва для пастаноўкі п'есы на сцэне. Р. называюць таксама заўвагі рэжысёра на рабочым экзэмпляры п'есы, адрасаваныя асістэнту рэжысёра, заг. пастановачнай часткі і інш. *І.А.Алекснiна.*

**РЭНА́НСКІ** Аляксандр Леанідавіч (н. 23.5.1942, с. Кенсай Ташкенцкай вобл.), кампазітар, педагог, культуролаг. Скончыў Бел. кансерваторыю (1970) па класах аргана (клас А.*Янчанкі*) і фп. (клас Р.Шаршэўскага). З 1969 выкладчык Брэсцкага муз. вучылішча, з 1972 муз. рэдактар Бел. тэлебачання і радыё. З 1975 выкладае ў Бел. ун-це культуры. У 1973—93 кампазітар і муз. кіраўнік Дзярж. рус. драм. т-ра Беларусі. Аўтар музыкі да спектакляў «Макбет» У.Шэкспіра, «Апошняя інстанцыя» М.Матукоўскага (абодва 1974), «Васіль Цёркін» паводле А.Твардоўскага (1975), «Апошнія» М.Горкага (1976), «Вяртанне ў Хатынь» А.Адамовіча і Б.Луцэнкі (1977), «Трагедыя чалавека» І.Мадача (1979), «Незвычайныя прыгоды салдата Івана Чонкіна» паводле У.Вайновіча (1990) і інш. у рус. драм. т-ры; «Святая святых» І.Друцэ (1978), «Надзея Путніна, яе час, яе спадарожнікі» І.Малеева (1988), «Памінальная малітва» Р.Горына і «Эмігранты» С.Мрожака (абодва 1989), «Ромул Вялікі» Ф.Дзюрэнмата (1997) у Нац. акад. т-ры імя Я.Купалы; «Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра (1987) у Бел. т-ры імя Я.Коласа і інш. Супрацоўнічае таксама з рознымі тэатрамі Расіі, Украіны, Латвіі, Грузіі, Узбекістана і інш. Тэатр. музыцы Р. ўласцівыя глыбокае пранікненне ў аўтарскую стылістыку, дакладнасць увасаблення рэжысёрскай задумы, яскравая вобразнасць муз. мовы. Дыпламант усесаюзных тэатр. фестываляў: прысвечанага 30-годдзю Перамогі ў Вял. Айч. вайне (1975), «Рампа дружбы» (1991), венг. (1979) і польск. (1989) драматургіі.

**РЭПЕРТУА́Р** (франц. répertoire ад лац. repertorium спіс, вопіс), сукупнасць твораў (драматычных, музычных і інш.), якія выконваюцца адным тэатральным калектывам на працягу сезона або пэўнага перыяду часу; таксама кола роляў, у якіх выступае акцёр. Адрозніваюць Р. сучасны (творы пра сучаснае жыццё) і класічны (нац. і сусв. класічная драматургія, класічныя муз. творы), а таксама па відах тэатра (драматычны, муз., эстрадны, оперны і інш.). Тэрмін «Р.» выкарыстоўваецца і пры падборы п'ес аднаго жанру (Р. камічны, трагічны, гіст. і г.д.). Р. выяўляе ідэйна-эстэтычныя і маст. мэты і кірункі творчасці тэатра. На Беларусі тэатр з усталяваным Р. прынята называць рэпертуарным. Яму процістаіць эксперым. і камерцыйны тэатр. *І.А.Алекснiна.*

**РЭПЕТЫ́ЦЫЯ** (ад лац. repetitio паўтор), асноўная форма падрыхтоўкі спектакля; работа па вывучэнні тэксту і сцэнічнай ігры, якую выконваюць акцёры пад кіраўніцтвам рэжысёра; дзейнасць, якая займае ўсю трупу і прымае розныя формы. У працэсе Р. адбываецца чытанне, абмеркаванне роляў, шматразовае іх выкананне па сцэнах, актах і ўсяго спектакля ў цэлым. У ходзе Р. рэжысёр імкнецца раскрыць ідэйны змест драм. твора, дасягнуць яркасці выяўл. вобразаў, знайсці дасканалыя мізансцэны і выяўл. маст. сродкі для вырашэння спектакля. Адрозніваюць Р. «застольныя» (ана-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліз драм. твора), «у выгарадках» (у рэпетыцыйным памяшканні без дэкарацый, толькі з мінімальнымі яе элементамі), на сцэне (спачатку ў частковым, потым у поўным маст. афармленні), манціровачныя (канчаткова вызначаецца дэкарацыйнае, светлавое, гукавое, шумавое, муз. афармленне спектакля), прагонныя (у час якіх акты і дзеі спектакля зводзяцца ў адзінае цэлае) і генеральныя (адбываюцца перад выпускам спектакля ў прысутнасці гледача). У муз. тэатры практыкуюцца Р. аркестравыя, канцэртмайстарскія (сольныя і ансамблевыя), харавыя, харэаграфічныя і інш. Рэпетыцыйны метад падрыхтоўкі выкарыстоўваецца таксама і ў працэсе падрыхтоўкі эстрадных канцэртаў, цыркавых праграм, масавых мерапрыемстваў, дзярж. святкаванняў і г.д.

*І.А.Алексніна.*

**РЭ́ПЛІКА** (франц. réplique, італьян. replica ад лац. replico паўтараю, адказваю), элемент сцэнічнага дыялога, фраза, якую акцёр гаворыць у адказ на словы партнёра, а таксама апошняя фраза, за якой ідзе тэкст іншай дзеючай асобы. Яна мае сэнс толькі ў сувязі папярэдніх і наступных Р. Мінімальнае адзінства сэнсу і становішча ўтвараецца парамі: рэпліка — контррэпліка, слова — контрслова, дзеянне — рэакцыя.

*І.А.Алексніна.*

**РЭСПУБЛІКА́НСКІ ТЭА́ТР БЕЛАРУ́СКАЙ ДРАМАТУ́РГІІ**. Створаны ў снеж. 1990 у Мінску як структурнае падраздзяленне Бел. т-ра імя Я.Купалы па рабоце з драматургамі. З 1993 атрымаў статус рэсп. тэатра і сучасную назву. Заснавальнік і першы маст. кіраўнік тэатра В.Мазынскі. З вер. 2000 тэатр узначальвае В.Анісенка. Гал. мастак В.Цімафееў (да 2000). З вер. 1994 працуе з пастаянная трупай, сфарміраванай з выпускнікоў акцёрскага аддзялення Бел. АМ (маст. кіраўнік курса Мазынскі). Спектаклі ідуць на бел. мове. Першы спектакль — «Ку-ку» М.Арахоўскага (1.2.1992). Т-р аддае перавагу творам пачынаючых драматургаў, у рабоце з якімі выкарыстоўваюцца індывідуальныя формы працы, штогод праводзяцца семінары, сцэн. чытанні п'ес па ролях і інш. Найб. ўвагу аддае фарміраванню бел. рэпертуару: «Барбара Радзівіл» Р.Баравіковай, «Галава» І.Сідарука, «Віта брэвіс, альбо Нагавіцы святага Георгія» і «Чорны квадрат» М.Клімковіча і М.Адамчыка, «Паваліўся нехта» паводле У.Галубка і Л.Родзевіча, «Містэр Розыгрыш» С.Кандрашова, «Пеўчыя» Г.Марчука, «Заложніца кахання» і «Стомлены д'ябал» С.Кавалёва, «Дзіця з Батлеема»





***Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі.*** *Сцэны са спектакляў «Апошняя пастараль» паводле А.Адамовіча (уверсе) і «Бот і яго шкарпэтка» Г.Ахтэрнбуша.*

М.Пінігіна, «Апошняя пастараль» М.Дзінава паводле А.Адамовіча, «Развітанне з Радзімай» А.Паповай, «Жанчыны Бергмана»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ